**Народны фальклорны калектыў “ Вярба”**
**Дрысвяцкага сельскага Дома культуры**



Народны фальклорны калектыў “Вярба” створаны ў 1989 г.пад кіраўніцтвам Шавела Эміліі Лявонаўны. Званне Народны прысвоена ў 1998 годзе. Калектыў пацвярджаў званне народнага ў 2013 і 2016 гадах. Праца калектыву першапачаткова будавалася на адраджэнні аўтэнтычных твораў. У калектыве налічваецца 16 чалавек на дадзены час пад кіраўніцтвам Гламбоцкай Тэрэзы Уладзіславаўны. Пастаянна прыходзяць новыя, маладыя ўдзельнікі.
У рэпертуары калектыву – беларускія і польскія народныя песні, танцы, гульні, абрады, тэатралізаваныя легенды і паданні. Рэпертуар пабудаваны галоўным чынам на мясцовым матэрыяле.

**Народнае аматарскае аб'яднанне “Ветразь надзеі”**
**Опсаўскага дасугава-літаратурнага цэнтра**



Аб'яднанне створана ў 1997 годзе. У 2002 годзе абараніла званне “Народны самадзейны калектыў”, якое пацвярджае на працягу 13 гадоў. Літаратурнае аб'яднанне з моманту заснавання працуе ў жанры паэзіі і прозы. Вялікая ўвага надаецца развіццю творчага майстэрства яго ўдзельнікаў. “Ветразь надзеі” налічвае ў сваім складзе 20 удзельнікаў. Гэта – настаўнікі, студэнты, працоўная моладзь, людзі сярэдняга і пажылога ўзросту. Рэгулярна падрыхтоўваюцца літаратурныя старонкі “Блакітны разліў”, якія друкуюцца ў раённай газеце “Браслаўская звязда”.

**Узорная студыя эстраднай песні “Фартуна”**
**Відзаўскага гарпасялковага дома культуры**



Узорная студыя эстраднай песні “Фартуна” створана ў 2002 годзе. У склад калектыву ўваходзяць дзеці, падлеткі і моладзь ад 7 да 23 гадоў. Рэпертуар студыі эстраднай песні “Фартуна” складаюць дзіцячыя, патрыятычныя, эстрадныя песні, а таксама народныя песні ў сучасных апрацоўках. У 2015 годзе ў рэперуар студыі ўвайшлі 32 новыя песні. Удзельнікі калектыву навучаюцца не толькі спевам, але і танцам, сцэнічнаму руху, акцёрскаму майстэрству. Рэпертуар падбіраецца кожнаму ўдзельніку студыі з улікам індывідуальных асаблівасцяў. Вядзецца працяглая праца над развіццём і ўдасканаленнем вакальнай тэхнікі і акцёрскага майстэрства з творчым падыходам да раскрыцця мастацкага вобраза. Салісты ўзорнай студыі эстраднай песні “Фартуна” таксама прымаюць удзел у раённых, абласных і міжнародных святах і конкурсах.

**Народны ансамбль песні “Відзаўчанка”**
**Відзаўскага гарпасялковага Дома культуры**



Ансамбль народнай песні “Відзаўчанка” пачаў сваю творчую дзейнасць у 1996 годзе. Мастацкі кіраўнік - Павініч Аляксандр Цімафеевіч. Узрост удзельнікаў калектыву ад 24 да 57 гадоў. Жанравай спецыфікай ансамбля “Відзаўчанка” з'яўляецца сінтэз некалькіх напрамкаў у музычным мастацтве: ансамблевых спеваў, харэаграфіі, акцёрскай гульні і інструментальнай музыкі. Гэтыя напрамкі арганічна і цесна звязаныя паміж сабой.
Апрацоўкі песень, разнастайныя па сваіх жанравых асаблівасцях, складаюць аснову рэпертуару ансамбля народнай песні “Відзаўчанка”.
Калектыў прымае ўдзел у шматлікіх канцэртах мастацкай самадзейнасці, прысвечаных Дню Перамогі, Дню маці, Дню Незалежнасці і іншых масавых мерапрыемстваў, якія праходзяць на сцэне Відзаўскага Дома культуры. Дае самастойныя канцэрты. Удзельнікі ансамбля ўвесь час удасканальваюцца ў вакальным, харэаграфічным і акцёрскім майстэрстве, што спрыяльна ўплывае на творчы рост калектыву.

**Народны тэатральны калектыў “Маскі”**
**Відзаўскага гарпасялковага Дома культуры**



Тэатральны калектыў “Маскі” існуе ў Відзаўскім гарпасялковым Доме культуры з 2003 года. На працягу дзевяці гадоў кіравала калектывам Еўчук Жанна Уладзіслаўна. Зараз кіраўніком калектыву з’яўляецца Павініч Яна Аляксандраўна. На сённяшні дзень у тэатральным калектыве “Маскі” займаецца 15 удзельнікаў ва ўзросце ад 14 да 52 гадоў. Гэта людзі рознага роду дзейнасці, але ўсіх іх аб’ядноўвае любоў да тэатральнай творчасці. Галоўнай задачай тэатральнага калектыву “Маскі” з’яўляецца фарміраванне і развіцце цікавасці да тэатральнага мастацтва і культуры беларускага народа, павышэнне агульнакультурнага і інтэлектуальнага ўзроўню, развіцце творчых здольнасцяў моладзі. Зараз вялікая частка акцёраў у калектыве – гэта творчая моладзь пасёлка. Вялікая ўвага ў калектыве надаецца вучэбнай дзейнасці: эцюдная праца, акцерскае майстэрства і сцэнічная мова, асновы харэаграфіі і сцэнічнага руху – ўсё гэта вывучаюць артысты-аматары.

**Народны тэатр гульні “Лёлі”**
**Раённага цэнтра культуры**



У складзе народнага тэатра гульні “Лёлі” налічваецца 15 чалавек. Сярод іх: творчыя работнікі раённага цэнтра культуры і сельскіх клубных устаноў, дзіцячай школы мастацтваў, Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў, настаўнікі сярэдніх школ і гімназіі.У красавіку 2018 года тэатр гульні “Лёлі” пацвердзіў ганаровае званне “Народны”.

**Народны тэатр**
**Раённага цэнтра культуры**



Калектыў заснаваны ў 1944 годзе ў Браславе як тэатральны гурток, у 1959 годзе прысвоена званне “Народны самадзейны калектыў”. У калектыве ўдзельнічае 15 чалавек. Сярэдні ўзрост калектыву 25-30 гадоў. Сярод удзельнікаў – работнікі сувязі, хлебазавода, адукацыі, прыватныя прадпрымальнікі і іншыя.
У рэпертуары калектыву спектаклі на сучасныя тэмы, сярод іх “Чысціня”, “Дзеці свету”, “А снег ідзе”. Народны тэатр Браслаўскага РЦК вядзе папулярызацыю сучаснай беларускай культуры. У 2015 годзе калектыў пацвердзіў званне “Народны самадзейны калектыў”.

**Народны хор ветэранаў вайны і працы**
**Раённага цэнтра культуры**



Народны хор ветэранаў з'яўляецца пастаянным удзельнікам канцэртаў, прысвечаным значным датам Рэспублікі Беларусь. У складзе хору 15 чалавек. Удзельнікамі з'яўляюцца людзі сталага ўзросту: былыя медыцынскія работнікі, настаўнікі.
Пры хоры створана жаночая вакальная група “Весялухі”, салісты, дуэты. Нягледзячы на тое, што аснову хору складаюць людзі сталага ўзросту, калектыў вельмі запатрабаваны ў Браславе і па ўсім раёне. Хор з'яўляецца жаданым госцем на ўсіх мерапрыемствах Браслава і Браслаўскага раёна. Акрамя таго, у асаблівых нумарах песні аб'ядналі з танцавальнымі элементамі.
Канцэртная праграма калектыву складаецца з беларускіх, рускіх, польскіх і ўкраінскіх песень; з беларускіх вершаў мясцовых паэтаў. Браслаўскі раённы выканаўчы камітэт узнагародзіў Ганаровай граматай за арганізацыю канцэртнай дзейнасці, за ўдзел у конкурснай праграме да Дня пажылых людзей. Хор ветэранаў узнагароджаны старшынёй раённага Савета ветэранаў.

**Народны ансамбль песні “На панадворку”**
**Раённага цэнтра культуры**



У склад ансамбля ўваходзіць 15 чалавек. Сярод удзельнікаў: работнікі культуры, медыцыны і адукацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі і іншыя.
У рэпертуары ансамбля песні не толькі беларускіх кампазітараў, але і песні мясцовых самадзейных аўтараў. Пры ансамблі створаны жаночая вакальная, інструментальная групы, дуэты, салісты.
За гады існавання і актыўнай творчай дзейнасці ансамбль заваяваў асаблівую ўвагу ў гледачоў і стаў добра знаёмым не толькі на раёне і вобласці, але і за яе межамі. Калектыў з'яўляецца нязменным удзельнікам раённых, абласных, рэспубліканскіх,

міжнародных святаў і фестываляў, святочных канцэртаў.

**Узорны танцавальны калектыў “Такт”**
**Раённага цэнтра культуры**



Харэаграфічны калектыў “Такт” быў створаны ў 2001 годзе. Званне “узорны самадзейны калектыў” атрымаў у 2007 годзе. І гэта званне з года ў год ён паспяхова пацвярджае дзякуючы энтузіязму, цярпенню і працаздольнасці ўдзельнікаў калектыву, а таксама прафесіяналізму кіраўніка, якія не спыняюцца на дасягнутым і заўсёды знаходзяцца ў творчым пошуку. У складзе калектыву 30 чалавек. У рэпертуары калектыву: беларускія танцы, танцы народаў свету, стылізаваныя і сучасныя танцы. За гады існавання і актыўнай творчай дзейнасці калектыў заваяваў асаблівую павагу ў гледачоў і стаў добра знаёмым не толькі ў горадзе Браславе, але і за яго межамі. Практычна кожнае культурна-масавае мерапрыемства раёна ўпрыгожваюць вясёлыя і яркія нумары з рэпертуару ўзорнага калектыву “Такт”.

**Народны ансамбль беларускай песні “Сябрына”**
**Ахрэмаўскага цэнтра нацыянальнай культуры**



Народны ансамбль беларускай песні “Сябрына” створаны ў 1992 годзе. 30.08.2001 года атрымаў званне “Народны самадзейны калектыў” і ў чацвёрты раз гэта ганаровае званне пацвердзіў.
У складзе групы “Сябрына” 15 удзельнікаў: настаўнікі сярэдняй школы, работнікі гандлю, работнікі ТБЗ, работнікі ЦНК. Аснову рэпертуару складаюць беларускія народныя песні, песні беларускіх кампазітараў. У рэпертуары маецца блок рускіх народных песень і блок польскіх народных песень у выкананні змешанай групы, жаночай групы, трыо, дуэта, салістаў. Апошні час гурт “Сябрына” працуе ў цеснай сувязі з мясцовым кампазітарам Альбертам Белусем. Песні гурта гучаць у 2-х, 3-х, 4-х галасавым выкананні.

**Народны тэатр мініяцюр “Покер”**
**Раённага цэнтра культуры**




Тэатр мініяцюр быў створаны ў 2006 годзе. У 2012 годзе калектыву прысвоена ганаровае званне “Народны самадзейны калектыў”. У калектыў тэатра уваходзіць 15 чалавек. Сярод удзельнікаў-супрацоўнікі раённага аддзела ўнутраных спраў, медработнікі, прыватныя прадпрымальнікі, работнікі ДУ “Нацыянальны парк Браслаўскія азёры” і іншыя. Аўтар і пастаноўшчык мініяцюр Яўген Набееў. У 2017 годзе пад кіраўніцтвам Яўгена Набеева калектыў народнага тэатра мініяцюр Раённага цэнтра культуры ажыццявіў пастаноўку жывых залатых скульптур, з якой за кароткі перыяд прыняў ўдзел не толькі ў раённых мерапрыемствах. Прафесійнае майстэрства народнага тэатра і тэатра мініяцюр “Покер” вядома

далёка за межамі нашага рэгіёну, таму не дзіўна, што гэтыя калектывы запрашаюць на розныя мерапрыемствы абласнога і рэспубліканскага ўзроўню, а таксама за прыбудоўкі нашай краіны.

**Народны клуб майстроў народнай творчасці “Ля возера”**



Працуе пры НДУК “Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў”. У 1980 годзе пры Доме культуры г. Браслава быў заснаваны клуб самадзейных мастакоў. Ён аб'ядноўваў 14 мастакоў-аматараў і займаўся развіццём і прапагандай выяўленчага мастацтва ў раёне. З 1986 года клуб пачаў працаваць пры гісторыка-краязнаўчым музеі. Да працы ў ім далучыліся майстры саломапляцення, вязання, вышыўкі, ткачыхі, ганчары, разьбяры. Аб'яднанне атрымала назву “Клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў “Ля возера”. Мэта клуба-адраджэнне, развіццё і папулярызацыя традыцыйных рамёстваў і народнай творчасці. Клуб займаецца арганізацыяй выстаў народнай творчасці ў г. Браславе, правядзеннем святаў, навучаннем рамёствам усіх жадаючых на занятках гурткоў і практыкумах, пошукам новых майстроў і мастакоў. Клуб штогод удзельнічае ў міжнародных святах і фестывалях. Майстры клуба праводзяць выязныя выставы.

**Аматарскае аб'яднанне “Кругагляд”**



Аматарскае аб'яднанне “Кругагляд” Відзаўскай гарпасялковай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна” было створана ў 1984 годзе. У 2002 годзе аб'яднанню было прысвоена найменне “Народны самадзейны калектыў”. Напрамак дзейнасці-папулярызацыя беларускай і замежнай літаратуры, эстэтычнае, прававое выхаванне і адукацыя, прапаганда здаровага ладу жыцця.

Аб'яднанне “Кругагляд” цесна супрацоўнічае з прадстаўнікамі мясцовых органаў улады, педагогамі школ і каледжа, спецыялістамі ГДК і іншых устаноў пасёлка і раёна.

Членамі аб'яднання з'яўляюцца 22 чалавекі. Гэта настаўнікі сярэдняй і музычнай школ, выкладчыкі Відзаўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, медработнікі мясцовай бальніцы, былыя работнікі гэтых устаноў, пенсіянеры. Пасяджэнні аб'яднання праходзяць кожную апошнюю нядзелю месяца.